# СЯЛЯНСКАЕ САМАКІРАВАННЕ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАРЭФОРМЕННЫ ПЕРЫЯД: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ

Талмачова С.А.
г. Мінск

Саслоўнае сялянскае самакіраванне ў парэформеннай Расіі на беларускіх землях сур'ёзна не даследавалася вучонымі, але атрымала адназначную, галоўным чынам, адмоўную ацэнку ў публіцыстычнай і навуковай літаратуры. У адных выпадках гэта было звязана з эмацыянальным адмаўленнем заганаў сялянскага жыцця і недахопаў механізмаў самакіравання. Такі падыход праявіўся галоўным чынам у дарэвалюцыйным друку. У савецкай гістарыяграфіі панаваў другі галоўны пастулат, які зводзіўся да таго, што сялянства было пасіўным аб'ектам заканадаўства 1861 г. і сродкам у руках самадзяржаўя, якое поўнасцю падпарадкавала абшчыну сваім фіскальным і палітычным інтарэсам.

Сялянскае самакіраванне ў парэформенны перыяд прыцягвала ўвагу сучаснікаў рэформы. У.П.Безабразаў, А.І.Васільчыкаў, А.І.Кошалеў, К.К.Сцефановіч, А.Арапаў, М.М.Катаеў, А.І.Мілавідаў [1] ды інш. разглядалі асобныя бакі дзейнасці органаў сялянскага самакіравання. Публікацыі аб'ядноўваліся думкай аб неабходнасці рэфармавання ўсіх мясцовых установ і перш за ўсё сялянскіх. Некаторыя з аўтараў сканцэнтравалі ўвагу на ідэі шкоднасці для сялян залішняй апекі з боку мясцовай адміністрацыі, а іншыя, наадварот, лічылі, што апека была недастатковай. К.К.Сцефановіч, А.Арапаў ды інш. указвалі, што ў Паўночна-Заходнім краі неабходна ўвядзенне моцнай улады, якая б кіравала дзейнасцю органаў сялянскага самакіравання. Гэтыя публікацыі змяшчаюць значны фактычны матэрыял, аднак носяць галоўным чынам публіцыстычны характар.

Выказванні У.І.Леніна аб абшчыне аказалі моцны ўплыў на пазнейшую гістарыяграфію. У савецкай гістарыяграфіі пераважаў погляд на парэформенную абшчыну як на дадатак фіскальнага апарату самадзяржаўнай манархіі. У расійскай савецкай гістарыяграфіі шмат работ, якія асвятляюць дзейнасць органаў сялянскага самакіравання асобных рэгіёнаў. Многія публікацыі былі прысвечаны ўвогуле расійскай вёсцы. Сярод іх можна вылучыць працы Н.М.Дружыніна, С.М.Сідзельнікава, В.А.Аляксандрава, Л.В.Данілавай, П.А.Зайанчкоўскага ды інш. [2]. Усе яны напісаны на падставе марксісцка-ленінскай метадалогіі і класавага падыходу, таму захоўваюць схільнасць да палітызацыі праблемы. Увогуле ў савецкай гістарыяграфіі роля сялянскага самакіравання прыніжалася. Галоўным было палажэнне, што ў самадзяржаўнай Расіі рэальнага самакіравання не магло быць. А між іншым, царская адміністрацыя надавала важнае значэнне сялянскаму самакіраванню, асабліва ў Паўночна-Заходнім краі, каб нейтралізаваць уплыў дваранства рымска-каталіцкага веравызнання.

У работах беларускіх савецкіх гісторыкаў М.Б.Фрыдман і Л.П.Ліпінскага [3] ўказвалася, што органы сялянскага самакіравання насілі фіскальны характар, гаварылася аб поўнай залежнасці выбарных сялянскіх устаноў ад мясцовага дваранства. Разам з тым, насуперак гэтым сцвярджэнням, прыводзіцца шмат фактаў, якія са староўчага боку раскрываюць рэалізацыю органамі сялянскага самакіравання фінансава-падатковай, прадстаўнічай, вытворчай функцый, а таксама некаторых іншых. Аграрныя адносіны ў Беларусі знайшлі адлюстраванне ў працах М.В.Доўнар-Запольскага, М.М.Улашчыка, Х.Ю.Бейлькіна, А.І.Кажушкова [4] ды інш. У іх асвятляюцца і асобныя аспекты дзейнасці органаў сялянскага самакіравання.

Значны ўклад ў распрацоўку азначанай праблемы ўнёс В.П.Панюціч [5]. У шматлікіх публікацыях, прысвечаных парэформеннай вёсцы, ім раскрываюцца многія бакі жыцця сялянства, у тым ліку дзейнасці абшчыны.

Асабліва актыўна сталі вывучацца і пераглядацца многія пытанні аграрных адносін XIX–XX стст. у гады існавання Рэспублікі Беларусь. Асобныя пытанні азначанай тэмы разглядаюцца ў працах гісторыкаў У.П.Крука, М.М.Забаўскага, У.С.Пуціка [6] ды інш. Неабходна адзначыць акадэмічнае выданне "Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да 1996 г." [7]. У ім на аснове вялікай колькасці разнастайных архіўных і друкаваных крыніц і абагульнення спецыяльнай літаратуры асвятляецца гісторыя сялянства парэформеннай эпохі.

Нельга абыйсці ўвагай апублікаваныя крыніцы. Сярод іх трэба вызначыць даклад урадавай камісіі ("Валуеўскай"), якая даследавала становіш-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ча сельскай гаспадаркі Еўрапейскай Расіі ў пачатку 70-х гг. XIX ст. Значнае месца ў вывучэнні дзейнасці сялянскага самакіравання займаюць "Працы мясцовых камітэтаў аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці" [8]. У заканадаўчых актах і ўрадавых пастановах, а таксама цыркулярных распараджэннях адміністрацыі беларускіх губерняў у дачыненні да ўладкавання і дзейнасці органаў сялянскага самакіравання адлюстраваўся асаблівы стан 5 беларускіх губерняў у сувязі з вызваленчым рухам другой паловы XIX ст.

У шматлікіх дарэвалюцыйных перыядычных выданнях адлюстраваліся тыя працэсы, што адбываліся ў вёсцы. Многія з публікацый носяць тэндэнцыйную афарбоўку, аднак адлюстроўваюць тыя грамадска-палітычныя працэсы, што адбываліся ў краі [9].

Такім чынам, аналіз літаратуры і крыніц дае магчымасць аднавіць аб'ектыўную карціну дзейнасці органаў сялянскага самакіравання ў беларускай вёсцы ў парэформенны перыяд і зрабіць навукова абгрунтаваныя высновы аб яго месцы ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларускай вёскі ў другой палове XIX ст.

**Літаратура:**


1. Безобразов В.П. Государство и общество. – СПб., 1882; Васильчиков А. О самоуправлении: Сравнительный обзор русских и иностранных земских и общественных учреждений: В 3-х т. – СПб., 1869–1871; Кошелев А. Об общинном землевладении в России. – Берлин, 1875; Ён жа. О крестьянском самоуправлении и о присутствиях по крестьянским делам. – М., 1881; Стефанович К. О сельском и волостном управлении в Северо-Западном крае. – СПб., 1895; Арапов А.В. Краткий исторический очерк крестьянского вопроса и деятельности крестьянских учреждений Витебской губернии со дня обнародования Высочайшего Манифеста 19 февраля 1861 г. и до наших дней (50-летие). – Витебск, 1911; Катаев М.М. Местные крестьянские учреждения 1861, 1874 и 1889 гг.: Исторический очерк их образования и норм деятельности: В 3-х ч. – СПб., 1911–1912.
2. Дружинин Н.М. Русская деревня на переломе. 1861–1880 гг. – М., 1978; Сидельников С.М. Аграрная политика самодержавия в период империализма. – М., 1980; Александров В.А. Сельская община в России (XVII – начало XIX в.). – М., 1976; Данилова Л.В. Место общины в системе социальных институтов // Проблемы аграрной истории: Сб. ст.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– М., 1986; Зайончковский П.А. Отмена крепостного права в России. 3-е изд. – М., 1968.
3. Фридман М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. – Мн., 1958; Липинский Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (вторая половина XIX века). – Мн., 1971.
4. Довнар-Запольский М.В. Народное хозяйство Беларуси 1861–1914 гг. – Мн., 1926; Улашчык М. Выбранае. – Мн., 2001; Бейлькин Х.Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии 1861–1914 гг. – Мн., 1989; Кожушков А.И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX в. – Мн., 1963.
5. Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. – Мн., 1990; Ён жа. Дзяржаўныя падаткі сялян Беларусі ў 60–90-я гады XIX ст. // Весці НАН Беларусі. – Сер. гуманіт. навук. – 1998. – № 3. – С. 66–73; Ён жа. Земскія, грамадскія і іншыя падаткі, павіннасці і плацяжы сялян Беларусі ў 60–90-я гады XIX ст. // Весці НАН. – Сер. гуманіт. навук. – 2000. – № 3. – С.71–75.
6. Крук У.П. Сялянскі рух на Беларусі. 1864–1900 / Пад рэд. М.В.Біча. – Мн., 1993; Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 –1917 гг.) – Мн., 1999; Забаўскі М.М., Пуцік У.С. Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі (1906 –1917 гг.). – Мн., 1998; Пуцік У.С. Уплыў сялянскага зямельнага права і пазямельных адносін на фарміраванне грамадскага і пазямельных поглядаў сялянства //Весці БДПУ. – 2001. № 3. – С. 147–158.
7. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: У 3 т. Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. /З.Е.Абезгауз, Х.Ю.Бейлькін, А.Р.Бухавец і інш.; Пад рэд. В.П.Панюціча. – Мн, 2002.
8. Доклад высочайше учрежденной комиссии для исследования нынешнего положения сельского хозяйства и сельской производительности в России. Доклад. Журналы Комиссии; Прил. I–VII. – СПб., 1873; Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности: В 58 вып. / Вып. IV, V, XI, XXI, XXII. – СПб., 1903.
9. Миловидов А.И. Устройство общественного быта крестьян при графе М.Н.Муравьеве // Виленский календарь на 1903 г. Вильна, 1902. С.218-250; С. Крестьяне в Северо-Западном крае // Устои. 1882. № 1. С.95-125; С. О крестьянском самоуправлении // Устои. 1882. № 2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ